1Бо 162706
83.3(4Бел)7-8
Г56

Асоба і час



# УЛАДЗІМІР ГНІЛАМЁДАЎ:

## «Заставацца сабой...»

1БО 1Б2706
83.3(4Бей)7-8
Г56

АСОБА І ЧАС

# УЛАДЗІМІР ГНІЛАМЁДАЎ:

## «Заставацца сабой...»

МІНСК
ВЫДАВЕЦТВА «ЧЕТЫРЕ ЧЕТВЕРТИ»
2012

12 И

*Валянціна ЛОКУН*

# ПРОЗА УЛАДЗІМІРА ГНІЛАМЁДАВА: АДРАДЖЭННЕ НАЦЫЯНАЛЬНАГА ЭПАСУ

У свой час Г. Гачаў адзначаў, што «ў руху гісторыі і асабліва ў XX стагоддзі зблізіліся і ўніфікаваліся ўсе народы... тым не менш у сваім ядры кожны народ застаецца сам сабою да таго часу, пакуль захоўваецца асаблівы клімат, поры года, пейзаж, нацыянальная ежа, этнічны тып, мова, — таму, што яны бесперапынна падпітваюць, аднаўляюць нацыянальны склад быцця і мыслення» [2, 430]. У. Гніламёдаў-празаік ужо на пачатку трэцяга тысячагоддзя імкнецца зразумець нацыянальны склад быцця беларусаў. Хто такія беларусы пад сонцам адзіным для ўсяго свету, беларуская этнакультура ў кантэксце іншых, далёкіх і блізкіх этнакультур? У гэтым сэнсе яго тэксты блізкія да мастацкіх дыскурсаў К. Чорнага, І. Мележа, І. Пташнікава, В. Быкава, У. Караткевіча... Яшчэ бліжэй — стылёва — яны стаяць да прозы І. Чыгрынава. Адрозненне ў тым, што У. Гніламёдаў імкнецца высвятліць нацыянальны склад быцця не толькі на «пераломе» гісторыі і не толькі беларускага народа, але і рускага — самабытнага па характару і паводзінах.

Напрошваюцца і больш аддаленыя паралелі, калі мець на ўвазе маштабы адлюстравання і жанравыя задачы, — «Чалавечая камедыя» А. дэ Бальзака, «Сага аб Фарсайтах» Д. Галсуорсі, «Іосіф і яго браты» Т. Мана. І зноў, наша, айчыннае — «Камароўская хроніка» М. Гарэцкага.

У. Гніламёдаў распачаў маштабную працу. Як і некалі К. Чорны, ён паставіў перад сабой задачу напісаць гісторыю Беларусі, дакладней, яе заходняга краю. Прычым напісаць менавіта ў раманах, як рабілі гэта яго слынныя папярэднікі. «Гэтая форма мяне не скоўвае, ні сюжэтна, ні эмацыяналь-

на, — прызнаецца сам пісьменнік. — Мае героі могуць думаць пра ўсё! І выказваць свае ацэнкі, уяўленні, перажыванні — галоўнае, каб гэта смачна, сакавіта атрымлівалася, бо раман, эпас — гэта паэзія ў прозе. І я гэтую паэзію хачу знайсці: і ў краявідах, і ў чалавечых адносінах, і ва ўчынках асобнага чалавека, яго жэстах, мове, характары, каб напісанае цешыла чытача» [12, 5]. Праўда, пры гэтым аўтар фармальна абазначае свой цыкл твораў як «Сямейная хроніка ў духу барока». Толькі нам здаецца, што гэтая фармальнасць ім самім практычна і разбураецца. Апавядальнае поле прасціраецца далёка за межы пазначанай ім «Сямейнай хронікі».

Першы раман **«Уліс з Прускі»** з'явіўся ў 2000 годзе. Ён прысвечаны амерыканскай адысеі галоўнага героя «Хронікі» Лявона Кужаля і закранае канец XIX – пачатак XX стагоддзя. (Асобным выданнем твор выйшаў у 2006 годзе ў выдавецтве «Мастацкая літаратура», а ў 2007 годзе быў адзначаны прэміяй «Залаты Купідон».) Другі раман **«Усход»** храналагічна звязаны з падзеямі Першай сусветнай вайны, бежанствам, рэвалюцыяй 1917 года, грамадзянскай вайной у Расіі. Ён друкаваўся на працягу 2003–2005 гадоў у часопісе «Полымя». Асобнай кніжкай, але ўжо пад назвай **«Расія»**, ён выйшаў у 2007 годзе. У тым жа «Полымі» на працягу 2006–2008 гадоў друкаваўся і трэці раман цыкла — **«Вяртанне»** (асобна выйшаў у 2008 годзе). Тут аўтар адлюстроўвае няпростую сітуацыю 20-х гадоў у Заходняй Беларусі, якая падпала пад уціск Рэчы Паспалітай. У чацвёртым рамане **«Валошкі на мяжы»** (Полымя, 2009–2011 гг.) паказана далейшае развіццё падзей на Берасцейшчыне — 30-я і пачатак 40-х гадоў, — калі на змену ўлады палякаў прыйшла савецкая ўлада. Польская каланіяльная сістэма саступіла месца бальшавіцкаму дыктату.

Наперадзе нас чакаюць новыя творы, бо празаік мае намер прадоўжыць сваю «Хроніку».

Структурным стрыжнем «Хронікі», яе цэментуючым звяном з'яўляецца галоўны герой Лявон Кужаль — наш, беларускі

Уліс, селянін па паходжанні і па сваёй унутранай сутнасці. Менавіта праз свядомасць галоўнага героя, яго ўспрыманне аўтар намагаецца стварыць эпічны вобраз. «Мой герой, — адзначыць У. Гніламёдаў, — плыве, выплывае ў хвалях вялікага чалавечага мора. Гэта вельмі павучальна, таму што XX стагоддзе мае шмат «белых плямаў», а ў гісторыі застаецца толькі тое, што ўхвалена літаратурай» [11, 4].

Такой «белай плямай» да гэтага часу заставалася жыццё Берасцейшчыны, крэсаў Усходніх — самага «краю» беларускіх зямель, малой радзімы пісьменніка. Аўтар падае шматаблічны, драматычна-супярэчлівы вобраз гістарычнага часу, філасофію гэтага часу. Усё гэта мяжуецца з адлюстраваннем падзей, напісаннем псіхалагічна дакладных малюнкаў жыцця народа. Празаік стварае адметны мастацкі свет-універсум, — калі гаворка ідзе пра псіхалагічны бок адлюстравання. І пераходзіць на хранікальнае адлюстраванне пры перадачы падзей Першай сусветнай вайны, перыпетый рэвалюцыі 1917 года і грамадзянскай вайны ў Расіі, палітычнай сітуацыі ў Польшчы і ў крэсах Усходніх. Гэтыя апавядальныя лініі і стылёва адрозныя. Натуральная, разняволеная, «шматколерная» гутарковая мова кантрастуе з мовай дакумента, газеты, інфармацыйнай мовай.

Мастацкае поле У. Гніламёдава нібыта падзяляецца на дзве рознаўзроўневыя плыні: вобразна-псіхалагічную, побытавабыційную і хранікальна-падзейную. Рэальны план мяжуецца з метафізічным, духоўным, дзеянні і паводзіны персанажаў сумяшчаюцца з іх рэфлексіяй, унутранымі разважаннямі, перажываннямі і адчуваннямі.

«Я заўсёды іду ад факта, а не ад вымыслу, ад таго, што ведаю, сам бачыў, у чым цвёрда перакананы /…/ Вымысел у мяне дапаўняе тое, што знаходзіцца ў факце. Факт дае хуткасць, энергетыку вымыслу, забяспечвае паварот у разгортванні дзеяння» [13, 143], — раскрывае пісьменнік сакрэты сваёй мастацкай «кухні». Пэўна, таму тэксты празаіка насычаны фізічна адчувальнымі дзеяннямі і прадметамі, да-

кладнасцю матэрыі і пачуцця. У. Гніламёдаву, як і Марселю Прусту, ў яго геніяльнай працы «В поисках утраченного времени» было вельмі важна перадаць **сваё адчуванне** радзімы, **сваё** адчуванне часу, гісторыі праз сукупнасць **адчуванняў** сваіх продкаў, землякоў, праз сукупнасць фактаў чалавечага перажывання ўвогуле. Як і Прусту, У. Гніламёдаву было невыносна цяжка, што свет, які ён адчувае, носіць у сабе, знікне, сыдзе ў нябыт разам з ім. Знікне яго Пруска, яго эпоха, яго гісторыя,а разам з імі і тыя глыбінныя каштоўнасці, носьбітамі якіх яны з'яўляюцца. Адсюль і адна з галоўных задач пісьменніка — адлюстраваць жыццё роднай вёскі Пруска, у якой нараджаліся і жылі яго продкі, адкуль пайшоў ён сам. Жыццё анталагічнае па сваёй сутнасці, жыццё «быційнае», малапрыкметнае на знешнія падзеі, жыццё-сузіранне, жыццё-існаванне. Бо як падкрэсліць аўтар «Уліса з Прускі», ужо сам выгляд Прускі «менш за ўсё наводзіў на думку пра якія-небудзь змены» [3, 7]. Такім было жыццё «людзей на балоце» з мележаўскай «Палескай хронікі». Такім жыццём жылі і героі К. Чорнага, а пазней і І. Чыгрынава — асабліва ў рамане «Плач перапёлкі». Пакуль яны не былі ўцягнены ў «трагічны вір» гісторыі, сацыяльныя катаклізмы XX стагоддзя.

Сувязь з эпічнымі традыцыямі К. Чорнага, І. Мележа, І. Чыгрынава (да гэтых творцаў-эпікаў можна далучыць і рускага пісьменніка М.Шолахава, аўтара «Ціхага Дона») відавочная. Яна — у глыбіні быційнага адлюстравання, у канцэптуальным вырашэнні чалавека наогул і чалавека ***гэтага***, у непарыўнай повязі лакальнага, індывідуальна-непаўторнага свайго «дома», з «домам» ***нацыянальным***, а праз яго — з **агульначалавечым** прыродным «домам».

Прускаўцы, як адзначыць аўтар, яшчэ ў сваім першым рамане «Уліс з Прускі», «знаходзіліся, нават, можа, не адчуваючы гэтага, у той згодзе і адзінстве з прыродай, якія былі абавязковай умовай іх зямнога існавання. Нутраная спалучасць з зямлёй, вадой і небам, зладжанасць з усім навакольным жыццём нарадзіла ў іх падсвядомае адчуванне нязму-

шанай неабходнасці сваёй прысутнасці ў свеце...» [3, 11] Па аўтарскай логіцы, яны з'яўляліся арганічнай часткай бясконцага па часе і прасторы прыроднага космасу. І не простай яго часткай, а галоўнай — асноватворнай. У сувязі з гэтым і асоба чалавека раскрываецца ад яго індывідуальных рысаў — псіхалагічных, інтэлектуальных, сацыяльных і г. д. — да прыкмет агульных, анталагічных.

Першая сусветная вайна і звязаныя з ёю драматычныя выпрабаванні беларускага народа, а пасля Кастрычніцкая рэвалюцыя 1917 года, братазабойчая грамадзянская вайна, у вір якой былі ўцягнены славянскія народы, і нарэшце жыццё прускаўцаў «за польскім часам» — вось галоўныя тэмы раманаў «Хронікі».

Безумоўна, уздзеянне гістарычных падзей на шматлікія працэсы ў грамадскім, палітычным, эканамічным жыцці, у сферы духоўнай мае вялікае значэнне. У савецкай літаратуры гэты фактар лічыўся дамінантным. Постсавецкая літаратура пачала паступова адыходзіць ад гэтай схемы. Як адзначыў Я. Гарадніцкі, «нацыянальны менталітэт, духоўны і эстэтычны вопыт, светапоглядныя катэгорыі і мастацкія каштоўнасці, зафіксаваныя ў артэфактах беларускай літаратуры і ўсёй культуры ў цэлым, далёка выходзяць за межы, якія абазначаюцца нейкімі канкрэтнымі падзеямі і з'явамі, няхай сабе і самага вялікага маштабу» [1, 108]. Гэту выснову пацвярджае і мастацкі вопыт У. Гніламёдава.

Эпічная шырыня тэкстаў ўключае ў сябе найперш адлюстраванне духоўнай існасці людзей вёскі — той катэгорыі людзей, свядомасць і мараль якіх менш за ўсё трансфармавана соцыумам. У «Хроніцы» дамінуе калектыўнае «мы» вяскоўцаў. І не толькі прускаўцаў, у рамане «Расія» да іх далучаюцца і галасы запалонцаў — галасы рускага народа. Гэтае «ўзбуйненае» калектыўнае «мы» сінтэзуе «хоры» двух славянскіх народаў. З аднаго боку — нашчадкі старажытнага племені: «прусаў, яцвягаў, велетаў». Велетаў яшчэ называлі люцічамі. эта быў мужны і ваяўнічы народ, які прыйшоў

з-пад Карпат. «Велет азначае вялікі» [3, 7]. З другога боку, велеты — «далёкія нашчадкі беглых разінцаў і пугачоўцаў» [4, 124]. «Хоры» адлюстроўваюць псіхалагічную атмасферу свайго гістарычнага часу, з'яўляюцца радовішчам беларускіх і рускіх архетыпаў. А яшчэ, як сведчаць тэксты У. Гніламёдава, — гэта невычэрпная крыніца бясконцага іскрамётнага гумару. Народнага гумару.

«Суправаджаюцца» «хоры» насычанай хронікай гістарычнага часу, падзеямі Кастрычніцкай рэвалюцыі — з бясконцым пераходам улады з рук у рукі, ад белых розных адценняў да чырвоных. Эсэры, меншавікі, масоны, кадзеты, бальшавікі нібыта ў калейдаскопе змянялі адзін аднаго. То камбедаўцы, то калчакоўцы, то ўчрадзілаўцы, то чэхаславакі, то «таварышы», то «гаспада»... І ва ўсіх іх было толькі адно на мэце: «разбураць, паліць, знішчаць». «Брат супраць брата пайшоў, сын — супраць бацькі» [4, 414], «бліжні знішчае бліжняга і робіць гэта вельмі спакойна» [4, 497].

Аўтар вельмі дасканала перадае трагічную «арытмію» руху жыцця таго гістарычнага часу. Раз'юшаная стыхія вайны, рэвалюцыі 1917 года, а пасля польская каланізацыя і палітыка бальшавікоў у Заходняй Беларусі мелі на мэце цалкам падпарадкаваць чалавека ці зусім яго знішчыць. Апошняму асабліва паспрыяла рэвалюцыя 1917 года. Соцыум, пераканаы У. Гніламёдаў, дэфармуе асобу, ператварае яе ў функцыю. «Мы, таварыш Кудрашоў, — адзначыць прадстаўнік «чака», бальшавік Сычоў, — з табой як санітары. Сацыяльныя санітары» [4, 548].

Ідэя абсурднасці свету, вобраз зла становіцца шматаблічным. «Бальшавізм — гэта прыпадак, які здарыўся з нашым вопчаствам, асляпленне...» [4, 480] — адзначыць Ілья Аляксандравіч Платонаў, які раней хлебам усю Бельгію карміў і быў перакананы, што «ўласнасць на зямлі асвечана Богам!» [4, 413]. «Рэвалюцыя — гэта памрока, зацьменне. Як зацьменне сонца» [4, 512], — абагуліць свае назіранні запалонаўская Фёкла, будучая жонка беларуса Лявона Кужаля. Гэтая простая

непісьменная жанчына верыла, што «забіваючы іншага, чалавек знішчае адначасова і сябе... ахвяры вартыя сваіх катаў» [4, 512]. «Белыя, чырвоныя, яшчэ нейкія... Нічым яны фактычна паміж сабой не розняцца. Ваююць, ваююць, б'юцца...» [4, 461]. Бо «гвалт нараджае гвалт» [4, 512], — па-філасофску глыбакадумна адзначыць прускавец Ламака.

Сацыяльна-палітычныя катаклізмы — вайна, рэвалюцыя, грамадзянская вайна — ушчэнт расчалавечылі чалавека, «з выгляду быццам бы і людзі — рукі, ногі, галовы, але па тым, што яны вытваралі, прызнаваць іх за людзей як бы і не выпадала» [4, 511], — нібыта падводзіць вынікі гэтай народнай «дыскусіі» галоўны герой «Хронікі» Лявон Кужаль.

Закранаючы тэму беларускага і рускага народаў, У. Гніламёдаў шукае і знаходзіць — праз параўнанне і проціпастаўленне — нейкія важныя для сябе высновы. Славянскі свет — свет адмысловы, са сваімі «гукамі» і «фарбамі», са сваім прыроднапобытавым складам. Апынуўшыся ў глухой патрыярхальнай расійскай вёсцы, прускаўцы ўбачылі, што і там жыццё «цякло марудна і аднастайна» [4, 123]. «У нас жыццё вялае, — адзначыць Лявон, — але і тут яно не надта паспешлівае. Таксама як бы хто стрымлівае яго... Але сіла жыцця такая, як гэтая трава, што прабіваецца дзе толькі можна, каб сцвердзіць сябе, умацавацца, закрасавацць...» [4, 183] Гэткую ж няўмольную сілу жыцця прыроды герой адчуў пазней і на зямлі сваіх продкаў, калі апынуўся ў «сваім», прускаўскім, вялікім і ціхім лесе. Але разам з тым «ён ведаў, што цішыня і спакой — рэч абманлівая. Асабліва цяпер. У глыбіні быцця нешта варушыцца, нешта дзеецца, адбываецца, і тое, што адбываецца, — не да лепшага.» [6, 9] Узнікае ідэя агульнасці славянскага «дома». І агульнасці трагічнага лёсу славянскіх народаў. Першая сусветная вайна і рэвалюцыя паяднала «малодшых брацціяў» і старшага, бо «ацечаства ў нас адно, адзінае і недзялімае!» [4, 121].

Усё гэта нібыта яшчэ раз пацвярджаецца ідэяй адзінай касмічнай прасторы. «Месяц — чаго толькі ён не бачыў,

спрадвеку пазіраючы на гэту грэшную зямлю! /…/ ён, месяц, належыць усяму обчаству! Вот яно і харашо» [4, 237].

Гніламёдаву-раманісту XXI стагоддзя ўдалося найглыбока ўнікнуць у драматычную сутнасць сацыяльных, духоўных перамен першых дзесяцігоддзяў XX стагоддзя, маштабна адлюстраваць унутраную драму беларускага народа, які ў дадатак да вайны, бежанства і рэвалюцыі павінен быў прайсці і праз польскі ўціск, калі бальшавікі аддалі Польшчы заходнюю частку Беларусі. Польшча намагалася зрабіць крэсы Усходнія інтэгральнай часткай Рэчы Паспалітай, вынішчаючы пры гэтым усё беларускае: гісторыю, культуру і нават дух, духоўнасць. Панавала атмасфера турмы, рэпрэсій, агульнага прыніжэння. Пажары шугалі па ўсім краі.

«Крэсы Усходнія, — катэгарычна заявіць пан Падгурскі прускаўцам, — польская калонія, не больш. Вялікая дзяржава павінна мець калоніі, інакш якая яна дзяржава!.. Наша дзяржава павінна выконваць культурную місію на крэсах Усходніх! Гэта вельмі правільна, таму што… Літва ўся цалкам ёсць калонія Рэчы Паспалітай. Так! Паводле канстытуцыі 3 мая (маецца на ўвазе 1930 год. — В. Л.) Літва стала неад'емнай часткай Рэчы Паспалітай. Мы — адзін народ! Але вам трэба дапамагчы. Людзі з-за Буга прынясуць сюды культуру, навучаць тутэйшых працаваць на гаспадарцы» [6, 7].

Пісьменнік дакладна, у супярэчнасцях, перадае палітычную сітуацыю Заходняй Беларусі другой паловы 20-х – 30-х гадоў: Работніцка-Сялянская Грамада (РСГ), польская партыя сацыялістычная (ППС), суд над Верай Харужай, камінтэрнаўскі рух, забастоўка гуўняжоў, выбары ў польскі Сейм у сакавіку 1928 года, роспуск КПзБ у 1938 годзе, прыход Чырвонай Арміі і сумесны парад войск гітлераўскага вермахта і Масквы ў Брэсце летам 1939 года, і г. д. З гумарам, але, па сутнасці дакладна, гэты час перададзены словамі аднаго са шматлікіх агітатараў напярэдадні выбараў у Сейм: «Красный, белый, левый, правый. Разберись теперь лукавый. Все попуталось в мозгу, даже начать не могу. Поворачивай мозгами,

разберайся с номерами, их теперь про нашу честь тридцать шесть в Варшаве есть» [5, 377]. А былі ж яшчэ і людзі лесу, людзі начы, розныя там «збуічы» (рабаўнікі), якія таксама неслі людзям зло, рабаванне, насілле.

Не менш драматычным для прускаўцаў стаўся і канец 30-х – пачатак 40-х — прыход савецкай улады, які суправаджаўся засіллем ўсяго расейскага — мовы, культуры — і нават чыноўнікаў. Народ чакаў перамен да лепшага, але надзеі не спраўдзіліся. Вось яскравы полілог саміх вяскоўцаў — братоў Амброжыя і Якава Пацаў і Лявона:

— Лёс зменлівы... не дае чалавеку пажыць, як ён хоча, для сябе. Усё не так! Усё табой круціць! — адзначыў Якаў Арыстархавіч.

— А я табе казаў, — зірнуў на брата Амброжый, — так, як хочаш, не будзе, нешта абавязкова здарыцца не тое, дык іншае.

— Да гэтага мы, гоба на яго, былі польскай калоніяй, а цяпер да рускіх трапілі... — у тон яму паскардзішся Якаў Арыстархавіч. — **Вось так і матляемся паміж захадам і ўсходам** (падкрэслена мною. — В. Л.).

— Усё не так, як трэба, — азваўся Лявон... [9, 42] Вось так дакладна, вуснамі самога народа празаік выносіць свой вердыкт тым сацыяльным зменам, што адбыліся на Берасцейшчыне канца 30-х – пачатку 40-х гадоў. І не толькі гэтым зменам. Тут прачытваецца і больш абагульненая гістарычная выснова.

* * *

Трагічны герой сучаснай літаратуры пазначаны глыбінёй і багаццем душэўных станаў. Аб гэтым сведчаць тэксты хоць бы такіх пісьменнікаў, як В. Казько, А. Казлоў, А. Федарэнка, Ю. Станкевіч, А. Наварыч, У. Сцяпан. Яны пішуць аб трагічна-незваротным распадзе асобы чалавека, аб страшэнным разрыве паміж бачным і існым. Глыбінёй і багаццем душэўных станаў пазначаны галоўны герой «Хронікі»

Лявон Кужаль. «Голас» часу, акаляючыя ўмовы, зразумела, удзельнічаюць у фармаванні ўнутранага «я» Лявона, але яго духоўная сутнасць, або сакральнасць, падпарадкоўваюцца ў большай ступені генам роду, прыроднай існасці. Ён дбае пра мінуўшчыну, сваіх продкаў, бо гэта не толькі гісторыя, але і бацькаўшчына. «Пра сваё забываць не варта. Гэта — бацькаўшчына!» [5, 264] — перакананы Лявон. Такім чынам, галоўны ідэйны вектар аўтарскай канцэпцыі вобраза — гэта адстойванне героем асабовай суверэннасці ад жыцця палітычнага, намаганне ідэнтыфікаваць сябе ў прыродным вонкавым свеце, з якім злучаны безліччу повязей. Лявон Кужаль — гэта чалавек, які яшчэ не страціў велічыні, роўнай самому сабе. І ўсімі сіламі намагаецца гэтую велічыню захаваць — насуперак разбуральнаму ўздзеянню соцыума.

Лявон Кужаль — вобраз-тып, які па сваёй анталагічнай сутнасці стаіць упоравень з коласаўскім Міхалам і мележаўскім Васілём Дзятлікам. Менавіта стаўленне да зямлі вызначае характар і пазіцыю герояў Я. Коласа і І. Мележа. Лявон сваё жыццё і сваю будучыню таксама звязвае з працай на зямлі. На зямлі сваіх продкаў. Ён душою адчувае «прыемнае цяпло зямлі», яе жыццядайную сілу, а між тым лёс штурхаў яго па іншых жыццёвых сцяжынах. Герой хацеў проста жыць. Як жыў яго дзед Кірыла, як жылі прускаўцы, увесь беларускі народ. Жыць на сваёй зямлі і ў сваім доме — канкрэтным бацькоўскім доме. Вобразы зямлі і бацькоўскага дома ў прозе У. Гніламёдава насычаюцца глыбокім філасофскім зместам і набываюць статус архетыпаў нацыянальнага дома. Яны сінтэзуюцца ў абагульнены вобраз радзімы.

Першым жыццёвым выпрабаваннем Лявона была Амерыка. Прыроднаму славянскаму свету, гарманічнаму па сваёй унутранай сутнасці, процістаўляецца свет «рукатворны», ненатуральны, які пададзены аўтарам праз успрыманне самога героя: «Амэрыка — гэта Вавілон, тут змяшаліся ўсе народы, нацыі». Асабліва дзівіла Лявона існуючая там «нейкая адчужанасць», калі «нікому да цябе няма ніякай справы» [3, 237].

Прызыў у армію, на вайну Лявон успрыняў як чарговае наканаванне лёсу: «Вайна патрабуе ахвяр, як вогнішча — дроў. Значыць, трэба ісці насустрач лёсу — яго не абмінеш» [4, 246]. Так, зміры́ўшыся, разважаў Лявон Кужаль.

Пісьменнік не шкадуе адмоўных фарбаў, адлюстроўваючы царскую армію Першай сусветнай вайны. Як не шкадаваў у свой час М. Гарэцкі, ствараючы свой мастацкі дыскурс «На імперыялістычнай вайне», ці пісьменнікі «згубленага пакалення» — Э. Рэмарк («На заходнім фронце без змен»), Э. Хэмінгуэй («Бывай, зброя»), Д. Олдзінгтон («Смерць героя»), А. Барбюс («Агонь») і інш. Пераемнасць традыцый тут відавочная. Людзей ператваралі ў безгалосых аўтаматаў ужо ў вучэбным палку. Ад фельдфебеля Буса з «Хронікі» У. Гніламёдава «патыхала азлобленасцю на ўвесь навакольны свет» [4, 248]. Жыццё чалавека тут не мела ніякай каштоўнасці. «Помніце: чалавечае жыццё ва ўладзе Бога. Галоўнае, каб цар быў здаровы і Ацечаства жыло!» [4, 251] — абвясціў святар у час прыняцця прысягі. «Памерці за радзіму на полі брані — што можа быць прыгажэй, гаспада» [4, 253], — пафасна ўнушае навабранцам армейскі палкоўнік.

Неўзабаве Лявон адчуў, што ён таксама становіцца паслухмяным аўтаматам, выканаўцам чужой волі. «Няўжо, — думаў ён, — свет пабудаваны так, што чалавек павінен толькі або падпарадкоўвацца, альбо камандаваць, аддаваць загады» [4, 250]. Герой прыйшоў да высновы, што «армія — ды яшчэ ў час вайны — суцэльны здзек над чалавекам» [4, 251].

Паступова, прыгледзеўшыся да салдат, Лявон зробіць яшчэ адно адкрыццё: «і не салдаты яны зусім, а… большай часткай людзі зямлі, сяляне» [4, 264]. Такім чынам, «на мужыку ўсё трымаецца…» [4, 264] — і мір, і вайна. Асабліва жорстка распраўлялася з сялянамі вайна.

Вайна ўваходзіла ў свядомасць Лявона праз гукі артылерыйскай перастрэлкі: «гукі стрэлаў праціналі густы туман, упіваліся ў вушы і дзейнічалі на нервы» [4, 256]. Яму здавалася, што нібыта сама зямля «глуха стагнала», яму «хацела-

ся як мага шчыльней уціснуцца ў зямлю, забіцца ў нейкую шчыліну» [4, 256].

Вайна — крывавы хаос, у вір якога ўцягнены просты чалавек. «Як усё проста — быў чалавек і няма» [4, 258]. Такі няўмольны закон вайны. Трагічная яго сутнасць. Змяніць гэты закон ніхто не можа, бо «свет рухаецца сам па сабе, чалавек не ў стане паўплываць на ход падзей, ён слабы і таксама сам па сабе. Адзін чалавек мала на што здольны і мала чаго варты…» [4, 258]

Па У. Гніламёдаву, вайна, як найвялікае ў свеце зло, носіць фатальны характар. Носьбіты гэтага зла — буржуі. «У немцаў свае буржуі, у нас — свае. Тыя дураць іх, а нашы — нас. А мы што — мы выканаўцы. Як будзе загадана…» [4, 264] — пафіласофску глыбакадумна вызначыў сацыяльную прыроду «вайны-зла» Лявонаў сусед па акопу Лабук.

Гэта невыпадкова, што характар Лявона найбольшай рэфлексіяй пазначаны менавіта на вайне. Яму, селяніну па сваёй сутнасці, г.зн. ***стваральніку*** жыцця, цяжка станавіцца разбуральнікам, забойцам. Герой не адчуваў ніякай асабістай нянавісці да ворага. Ён закалоў свайго першага «рыжага доўгага немца» толькі таму, што «не я б яго, дык ён бы мяне. Усё проста, і ўсё складана…» [4, 270].

Як паказала літаратура аб Першай сусветнай вайне (А. Барбюс, Э. Рэмарк, Э. Хэмінгуэй, М. Гарэцкі), працэс пераўтварэння чалавека ў салдата-забойцу, выканаўцу чужой злой волі, заўсёды быў пакутліва-супярэчлівым, трагічным. Чалавек не вытрымліваў неймаверна цяжкага псіхалагічнага ўціску вайны. Нават тыя, што выжылі фізічна, духоўна заставаліся памерлымі.

Лявон Кужаль — таксама ахвяра вайны. Назіраючы за тым, як «рускія салдаты мясілі нямецкія акопы, а нямецкія — варушылі зямлю па гэты бок», героя «даймала не столькі фізічная, колькі нейкая больш глыбокая, нутраная стомленасць, якая напаўняла чалавека нерухомасцю і раўнадушшам да ўсяго навакольнага» [4, 271]. Лявон становіцца інакшым,

адрозным ад сябе ранейшага, «штосьці ў ім моцна пахіснулася. Узмацніўся скепсіс, прыгнечанасць. Жыццё здавалася суцэльным ланцугом драм і трагедый» [4, 306].

Перадаючы атмасферу страты старых ідэалаў, еўрапейскія пісьменнікі настойліва сцвярджалі ідэю бессмяротнасці чалавека. Э. Хэмінгуэй часоў Першай сусветнай вайны быў перакананы, што «вайна забівае кожнага», але разам з тым амерыканскі празаік шукаў альтэрнатыву непазбежнасці. І знайшоў — толькі каханне выратуе душу чалавека.

Герой У. Гніламёдава таксама кахае, але ў параўнанні з героямі «згубленага пакалення» на вайне ён ратуецца іншым — памяццю аб бацькаўшчыне, адчуваннем працы на зямлі. Бо і ў акопах Лявону снілася Пруска». Як бы мы ўсе разам выйшлі ў поле жаць жыта. Нават чуў пах пыскаўскага палыну…» [4, 206].

У. Гніламёдаў пагаджаецца з еўрапейскімі пісьменнікамі ў тым, што вайна з'яўляецца «вялікім прыніжэннем для чалавека» [4, 273]. Але тыя былі перакананы, што вайну спараджае соцыум, перад якім асобны чалавек бяссільны. Беларускі раманіст вызначае іншую прыроду вайны. Гэта — найперш стыхія, прыроднае бедства, Боскае пакаранне, наканаванне лёсу. «У свеце… дзейнічаюць нейкія неспазнаныя сілы, якія кіруюць чалавечымі ўчынкамі і самім чалавекам» [4, 285], — так лічыў герой «Хронікі». Лявон Кужаль пераконваў сябе, што «вайна — гэта чыясьці забава, нейкі вялікі падман, змова сатанінскіх сіл, пра якую ніхто не ведае, але яна, змова гэтая, існуе…» [4, 349].

Насцярожана ўспрымае Лявон і рэвалюцыю 1917 года. Для яго яна не меншае бедства, чым вайна. Сустрэўшыся ўпершыню з бальшавікамі на фронце, ён убачыў сярод іх «неблагіх людзей, якія хочуць спыніць вайну», але «дзіўныя надта — не хочуць дабра сваім…» [4, 276].

Паступова герой усё больш і больш будзе расчароўвацца ў людзях, якія ***ідэю*** ставілі вышэй за ***чалавека***, а галоўнае — адмаўлялі паняцце радзімы: «Увесь мір — наша родзіна!..

Куды пашлюць — там і родзіна!» [4, 594]. Праўда, У. Гніламёдаў у большасці сваёй схематызуе характары бальшавікоў, ператварае іх у вобразы-функцыі (Сычоў, Кудрашоў): «Ураджанне было такое, нібыта побач рамаўлялі чэрці, якія аб'явіліся на гэтым свеце, пакінуўшы сваю апраметную ў пошуках грэшнікаў» [4, 553–554]. Але ёсць і сапраўдныя рамантыкі, тыпу «філосафа» Касяткіна ці шчыра адданага ідэям камунізму старога бальшавіка, тэарэтыка рэвалюцыі, «апостала» Карла Мельперта. Або Андрэя Кляновіка, які «лічыў сябе агітатарам, арганізатарам мас, важаком!» [5, 91]. З'яўляючыся таксама нібыта «апосталам», неўзабаве Кляновік паправіць сябе, што «быць апосталам рэвалюцыі — гэтага… мала. Трэба быць яшчэ і дэманам. Дэман — гэта справа, дзеянне. Апостал — усяго толькі пасланец. Ён на слова абапіраецца, а слова яшчэ не ўсё, трэба арганізацыя, нязломная воля партыі…» [5, 310]. Але, як засведчыла гісторыя, і апосталы, і дэманы былі ідэалістамі, трагічнымі асобамі, бо ідэалы, за якія яны змагаліся і гатовы былі аддаць свае жыцці, аказаліся нежыццёвымі.

Зусім невыпадкова, што жыццёвыя сцяжыны Кляновіка і Лявона — па сутнасці герояў-антыподаў — увесь час перасякаюцца. У гэтых характарах ёсць нешта агульнае — гэта чэснасць і непахісная вера ў абранае імі жыццёвае крэда. Хоць у кожнага яно сваё. Адсядзеўшы амаль шэсць гадоў па чарзе ў турмах Пінска, Пружанаў, Брэста, Гродна, Вільні — на Лукішках, а пасля і ў варшаўскай «Фардоне» (а да гэтага сядзеў у турме ў Амерыцы, у Расіі — пры цары і пры Часовым урадзе) Андрэй Кляновік вяртаецца ў вёску, дзе чакала яго жонка Сцепаніда. Толькі перспектывы вясковага, сямейнага жыцця Кляновіка зусім не радавалі. «Жыццё ў Сенькавічах яго злавала і раздражняла. Яму ўвесь час здавалася, што навокал зашмат святла, зашмат непатрэбнай мітусні і дробных, як на яго асобу, турботаў. І ўсё нейкае бязмэтнае, бесталковае і, па сутнасці, абсурднае. Суцэльная аднастайнасць: што ўчора было, тое і заўтра будзе, ніякіх змен, ніякай радасці!»

[5, 405–406] Кляновіку, чалавеку ідэі, «апосталу» і «дэману» рэвалюцыі, хацелася барацьбы, змагання, актыўнага дзеяння. І ён зноў, нягледзячы на рэальную небяспеку, ідзе ў невядомасць…

Дыялогі Лявона і Кляновіка — не проста палеміка, гэта сутыкненне процілеглых стаўленняў да жыцця, выяўленне сапраўднай ролі чалавека ў гістарычным развіцці.

Пасля, замест Кляновіка, у жыцці Лявона з'явіцца Косця Хлябіч, свой прускаўскі рэвалюцыянер-рамантык. Вязень шматлікіх польскіх турмаў, ён, як і Кляновік, шчыра верыў у рэвалюцыю і, як мог, за яе змагаўся. «У мяне такое ўражанне, — казаў яму Лявон, — што не шкадуеце вы чалавека».

— «А што рабіць? Нас таксама крыўдзяць», — пераконваў яго малады прускавец. «Класы існуюць, і барацьба непазбежная. Марксістаў трэба чытаць, тады ўсё стане зразумела!» [6, 61, 39] — упэўнены ў сваёй праўдзе быў Косця. Пэўным здзекам лёсу можна лічыць фінал палітычнай дзейнасці Косці Хлябіча. Яго, адданага марксісцкім ідэям рэвалюцыянера, зноў арыштоўваюць і саджаюць у турму. Цяпер ужо паруліліся бальшавікі — НКУС, герой абвінавачваецца ў шпіёнскай дзейнасці — «у… карысць польскай дзяржавы на падрыў мошчы СССР» [10, 20]. У камеры ён аказаўся разам з Якавам Арыстархавічам Пацам — адным з тых, супраць каго ён адчайна змагаўся.

Ці спачуваў Лявон Кужаль такім, як Кляновік, Косця Хлябіч? Канешне спачуваў, аб гэтым сведчаць іх бясконцыя дыялогі аб лёсе простага чалавека, народа ў цэлым. Толькі Лявон быў хрысціянінам па сваёй духоўнай сутнасці. Палітыка, а тым больш палітыканства, Лявона не цікавілі. «Відаць, я лішні сярод тых, хто будуе новы свет. Мне трэба заставацца ў старым. Па-новаму я ўжо не патраплю…» [4, 595] Ды і ўвогуле, «нашто селяніну палітыка, калі хапае зямлі? Вырасціў што — прадаў» [5, 108].

Герой У. Гніламёдава імкнецца адстаяць сваю ўнутраную свабоду, свабоду ад рэвалюцыі, ідэалогіі і палітыкі. Ад усіх

злых сіл, якія актывізаваліся ў час міжваеннага ліхалецця. «Чаго ж яны ад мяне хочуць?.. Чаго ім ад мяне трэба?» [5, 233] — дзівіўся Лявон, з усіх сіл баронячы свой суверэнітэт. Разам з тым ён намагаўся зразумець прычыну бунтоўнасці чалавека, прыроду зла, якое ўсё больш авалодвала чалавекам, яго свядомасцю. «Не, гэта не для мяне, — думаў Лявон, едучы з Брэста, дзе ён стаў сведкам разгону чарговай дэманстрацыі. — Не даецца чалавеку спакойнае жыццё, як бы знутры хто яго падбухторвае, казыча пад «мікіткі». Вядома, многае можна зразумець: беднасць, неаднолькавыя магчымасці, недахоп правоў, нястачы. І ніхто, як ні дзіўна, не хоча гэтага заўважыць, на сілу спадзяюцца — і адны, і другія. І канца няма. Але ж канец павінен быць! А можа, гэта часовыя адхіленні. Затрымка нейкая: істота чалавечая скіравана да дабра і справядлівасці, але ў кожнага сваё паняцце аб дабры, сваё разуменне справядлівасці» [6, 14]. Праўда таксама ў кожнага свая, дакладней, яе няма, «ёсць толькі дарога да праўды» [6, 14]. Такой «дарогай да праўды» для Лявона была ідэя зямлі.

Лявон Кужаль хацеў жыць сваім, «зямельным» інтарэсам, сваім домам, сваёй сям'ёй. «Толькі зямля дазваляе жыць сумленна. Калі яе даглядаць. Калі думаць пра яе» [5, 108]. Гістарычную перспектыву ён звязваў з дамінантнай якасцю свайго народа — працавітасцю: «Нас выратуе працавітасць, мы ўмеем працаваць» [5, 148].

Канцэпт зямлі як канцэпт свабоды быў вылучаны яшчэ класікамі нацыянальнай літаратуры — М. Гарэцкім, К. Чорным, І. Мележам. Менавіта ў працы на зямлі раманісты бачылі асноўны абавязак чалавека, яго пазітыўную сутнасць. Канцэпт зямлі ў беларускай літаратуры — а гэта стала і традыцыяй прозы У. Гніламёдава — набывае статус філасофскай катэгорыі, трансфармуецца ў катэгорыю духоўнага плана. «Зямля ўсё ж такі нешта большае, чым тыя простыя рэчывы, з якіх яна, здавалася б, складаецца...» [5, 29] — адзначыць пісьменнік.

Звернемся да сцэны вяртання Лявона пасля сямі год бежанства ў родныя мясціны. У плане псіхалагічным гэта сцэна выпісана вельмі дакладна, эмацыянальна, праўдзіва. З прыбліжэннем да Прускі «сэрца (Лявона. — В.Л.)... поўнілася радасцю і адначасна нейкай смутнай трывогай. Ён міжволі ўспомніў, як некалі вяртаўся сюды з Амерыкі. Тады, здаецца, не хваляваўся так, як цяпер. З набліжэннем Прускі сэрца білася гучней... Прыдарожныя вербы і хмызнякі запахлі чымсьці мілым і блізкім. <...> І вось — Пруска... Сэрца ажно разрывалася ад радасці і гатова было выскачыць з грудзей» [5, 6].

З паняцця зямлі «вырастае» паняцце радзімы. Яны — роўнавялікія. Радзіма — гэта не толькі дом, сям'я, вёска, блізкія людзі. Радзіма для Лявона — гэта яшчэ зямля яго продкаў, і ягоная зямля — расквечаная фарбамі і незлічонымі гукамі. А яшчэ — гэта пах чабора. «Адчуванне было такое, што да гэтага ён знаходзіўся недзе ў паветры, без апоры, а вось цяпер нарэшце вярнуўся на зямлю» [5, 9]. Сваю зямлю, дададмо.

Пруска, якая была і пад аўстрыякамі і пад немцамі, і нават у складзе Украінскай Народнай Рэспублікі, і пасля зноў пад бальшавікамі, і вось зноў пад Польшчаю, — гэтая Пруска для Лявона зусім не змянілася: «над казённым лесам заходзіла сонца, крануўшыся гарызонту ў тым самым месцы, што запомнілася да бежанства» [5, 9]. Але малюнак гэты яшчэ і сімвал трывушчасці жыцця, сведчанне перавагі спрадвечнага прыроднага над сацыяльным.

Вяртанне Лявона на родную зямлю, да плуга і сявенькі сталася яго паратункам. Сцэна сяўбы — сапраўдная «песня» Гніламёдава-мастака. «Ужо ярка свяціла сонца. Пад гэтым бляскам усё бачылася яму (Лявону. — В. Л.) у нейкай біблейскай значнасці і цнатлівасці. Ён пачапіў сявеньку на шыю і перад загонам адчуў, як перахапіла дыханне. Супакоіўшыся, размахнуўся і кінуў першае зерне, зрабіў крок, другі і пайшоў, левай, параненай, рукой шчыльна прыціскаючы сявеньку да грудзей, а правай, здаровай, у рытм з чарговым

крокам, кідаў зерне... У душы ярчэй загараліся вугольчыкі надзей і жаданняў, абуджаўся жар азартнага выкліку жыццю, вярталіся сілы і вера ў магчымасць чалавечага шчасця пад гэтым небам. Ён знайшоў сябе і сваё прызванне, канчаткова ўпэўніўся ў тым, што сам павінен ладзіць сваё жыццё» [5, 30]. Ладзіць сам, абапіраючыся на традыцыі сваіх продкаў. Як некалі ладзіў сваё жыццё дзед Кірыла. Той жыў як чалавек і адначасова быццам як дрэва, спалучыўшыся ў адно цэлае з зямлёй і з усім прыродным улоннем... «Вось каб і мне так! А што? Можа, гэта і ёсць выйсце! І я буду мацней за ўсіх вас — і збуічаў, і санацыю, і камуністаў, і самога Пілсудскага!..» [5, 386]. Нарэшце зразумеў сэнс свайго зямнога прызначэння герой У. Гніламёдава.

Такім чынам, трагічны матыў, заяўлены ў першых дзвюх кнігах «Хронікі», у рамане «Вяртанне» прасвятляецца верай у чалавека, яго жыццядайную сілу. Лінія развіцця вобраза Лявона Кужаля падкрэслівае настойлівую неабходнасць самабытнага ўдзелу чалаека ў стваральным жыцці.

Толькі фінал рамана «Валошкі на мяжы» ўносіць у вобраз Лявона новы дысгарманічны матыў.

Усё, аб чым раней марыў герой у сваіх «блуканнях па пакутах», здаецца, збылося. Ён збудаваў сабе дом, займеў добрую гаспадарку, нават малатарню прыдбаў, а галоўнае, купіў зямлі ў Пацаў, стаў заможным гаспадаром. Такім чынам, «жыццё ішло сваім ходам» [9, 9], нягледзячы ні на што.

Але вось матыў трывогі. Надышло лета 1939 года, а з ім і вялікія змены. Спачатку ў Пруску прыйшла Чырвоная Армія, а ўвосень Народны сход у Беластоку абвясціў савецкую ўладу на ўсёй тэрыторыі Заходняй Беларусі і прыняў дэкларацыю аб яе ўваходзе ў склад БССР. Вясной 1940 года ў маёнтку пана Падгурскага пачалася арганізацыя камуны. «Свет страціў ранейшы свой парадак...» [9, 41].

Лявон 20–30-х гадоў — гэта сцвярджэнне ідэі захавання ўнутранага «я» беларуса, яго нацыянальнага «дома», захавання пераемнасці духоўнага ладу жыцця. Лявон 40-х гадоў —

гэта ўжо матыў страчанасці спрадвечных духоўных сувязей паміх людзьмі, паміж чалавекам і «домам». Трагедыя Лявона яшчэ і ў тым, што ён стаў апоншім з магікан сялянскага роду Кужаляў. Яго вялікая радасць у жыцці — Васятка, які быў не ягоным сынам, але ён гадаваў яго, як свайго, здрадзіў не толькі вёсцы, калі падаўся ў горад, («У нас жа тут адно і тое ж, адно і тое ж, з году ў год! Нічога, апроч конскага хваста не бачыш» [10, 19]), але і яму, Кужалю, — бо адмовіўся ад яго прозвішча, вырашыў вярнуць сабе расейскае — Платонаў.

Род Кужаляў перарываецца...

* * *

У мастацкай канцэпцыі У. Гніламёдава вобразы герояў у мініяцюры мадэлююць працэсы інтэграцыі і дыферэнцыяцыі ў народным асяроддзі складаных сацыяльных працэсаў канца XIX і першых дзесяцігоддзяў XX стагоддзя. Разам з тым пісьменнік у сваіх тэкстах індывідуальна-непаўторнае імкнецца дапоўніць, заглыбіць да больш агульнага. Акрэсліваюцца характэрныя сацыяльныя тыпы сялян — ад зусім бедных да заможных, якія сфармаваліся ва ўмовах вясковай рэчаіснасці, з улікам спецыфічнага нацыянальнага каларыту. Праз нацыянальнае чалавек звязаны не толькі з пэўнай геаграфічнай прасторай планеты Зямля, але і з духоўнай гісторыяй, духам сваіх продкаў. Такі Лявон Кужаль, дзед Кірыла, Марыля, Гамон, Пракоп, Масей Галёнка, Захар Відэрка, Пятро Ламака, Васіль Каленік, Міхаль Тупчык, мясцовы блукальнаік па зямлі Кузёмка...

* * *

Топас дарогі ў беларускай літаратуры шырока распаўсюджаны: К. Чорны «Пошукі будучыні», В. Быкаў «Воўчая зграя», «Пайсці і не вярнуцца» «Аблава» і г. д. Ён нясе ў сабе самыя розныя семантычна-стылявыя адценні, садзейнічае выяўленню псіхалагічных адчуванняў герояў.

У. Гніламёдаў у «Хроніцы» таксама звяртаецца да гэтага вобраза-сімвала. Яго галоўны герой «увесь час знаходзіцца

ў дарозе...» [4, 347] Спачатку далёкая Амерыка, пасля бежанства, расійскае Запалонне, вяртанне ў Пруску... Канцэпт дарогі — структурная даміната лёсу героя. Менавіта праз матыў дарогі, ідэю вандравання, вобраз Лявона Кужаля зблізкаецца з сусветна вядомым вобразам Адысея ці Уліса. (Уліс у лацінскай транскрыпцыі, як пацвярджае сам пісьменнік, — гэта Адысей.) Вандраванне было іхнім наканаваннем, іхнім «блуканнем па пакутах», цяжкім жыццёвым выпрабаваннем.

Разам з тым метафарычны вобраз дарогі сваёй глыбокай філасофскай сутнасцю выходзіць за межы аднаго індывідуальнага лёсу. Ён закранае і іншыя «ўзроўні», больш агульныя. Дарога, па якой выбраліся прускаўцы ў бежанства, сімвалізуе рух усяго беларускага народа ў сваім быційным існаванні. Запаволенасць руху бежанцаў — гэта запаволенасць руху самой гісторыі. «Ехалі... паціху калдыбаліся... Спусціліся са стромкай Бабіцкай гары... Мінулі Ліпну, Мікалаева, праехалі Замасты... Рухаліся марудна» [4, 97–98]. Так напісаў У. Гніламёдаў у рамане «Расія». А вось яшчэ больш выразная паралель ужо з рамана «Валошкі на мяжы»: «Наперадзе і ззаду, даганяючы Лявона, скрыпелі чыесьці калёсы... Ён ведаў і любіў гэты спрадвечны скрып колаў на прасёлачных дарогах, рух, як нейкую ўсюдыісную галоўную прыкмету жыцця, як напамінак, што побач такія ж, як і ты, людзі, аб'яднаныя адной сялянскай доляй» [6, 9]. Спрадвечны запаволены рух беларусаў — гэта і ёсць іх доля, прадвызначаная самім Творцам.

Раманная прастора У. Гніламёдава пазначана прыкметай эпічнай запаволенасці.

Прозе пісьменніка — асабліва гэта тычыцца рамана «Расія» — блізкая паэтыка класічнага эпасу з яго няспешным рухам, з адчуваннем усеагульнага адзінства. Вось і прускаўцы, па сваёй сутнасці народ абшчынны, набыўшы статус бежанцаў, рухаліся на ўсход, а «з неба на ўсё гэта сумна глядзеў месяц» [4, 103]. Аўтар «Расіі» сцвярджае жыццё, што

развіваецца па законах прыроды — па-за чыёй-небудзь воляй. Вуснамі галоўнага героя пісьменнік адзначыць, што «…у Запалонным, жыццё людзей, усё іх існаванне залежылі ад зямнога і нябеснага ладу, ад таго, як павядуць сябе стыхійныя сілы прыроды» [4, 182]. Вёска жыла сваёй храналогіяй, дакладней, па кругавароце — сяўба, касьба, жніво. Зло, персаніфікаванае ў вобразе вайны, парушыла гэты спрадвечны рытм, спыніла кругаварот, і вось вынік — знік разумны пачатак, свет апынуўся на мяжы апакаліпсісу. «Лявону на нейкі момант нават здалося, што яны коцяцца ў нейкае незразумелае бяздонне, якое ўсё глыбей і глыбей паглынае іх усіх разам з конямі і возамі, з няхітрым дарожным скарбам» [4, 103]. «Лёс дарэшты хоча выкараніць наш народ…» — адзначыць стары Кірыла. «Не спрыяе нам лёс» [4, 103], — падтрымлівае яго маладзейшы прускавец Трафім. Гэта — галасы «стомленага» народа. Прускаўцы, як і ўвесь беларускі народ, сталі ахвярамі свайго лёсу-наканавання. «Увесь свет ахапіла вайна… **Гэта за грахі нашы!**» [4, 100–101] (падкрэслена мною. — В. Л.)

Вяскоўцаў страшыла дарога, яны адмаўлялі само слова «бежанец», бо «бежанцы мы, уцекачы, значыць» [4, 93]. Людзі адрываліся не толькі ад звыклага ладу жыцця, яны адрываліся ад роднай зямлі, роднага парога, адрываліся ад магіл продкаў:

— Трэба недзе надзейна прыхаваць плуг з бараной ды што-небудзь яшчэ…

— Крыж трэба паставіць, — сказала Марыля.

— Які крыж?

— На могілках. Каб назад вярнуцца! Калі крыж будзе стаяць, дык цягнуць сюды будзе! <…>

— Зямлі з сабой трэба ўзяць — жменьку хаця б. Людзі так робяць…» [4, 95–96], — нагадаў Кірыла.

Узнікае трагічная па сваёй сутнасці бязмежная быційная прастора, пасярод якой рухаюцца прускаўцы, рухаецца ўвесь народ беларускі. У невядомасць. У залежнасць. Ад самога свайго пачатку. Усё далей ад свайго прыроднага ці першароднага «я».

У раскрыцці духу народа В. Бялінскі бачыў прыкметы эпапеі. У цэнтры эпапейнага па сваіх маштабах адлюстравання У. Гніламёдаў «паставіў» дух «стомленага народа», якому «надакучыла думаць пра будучыню, ён даўно ўжо адвык ад гэтага занятку. Проста — жыў, па інерцыі» [4, 205]. Але разам з тым менавіта гэты народ умеў выжываць ва ўмовах, у якіх і «звер не можа» [4, 101].

Першая сусветная вайна — гэта этап у выпрабаванні прускаўцаў. Зло ў тэкстах пісьменніка набудзе і іншыя свае персаніфікацыі: Кастрычніцкая рэвалюцыя, бальшавіцкі тэрор, уціск Рэчы Паспалітай. Гэты «стомлены» ад жыцця народ павінен будзе зноў і зноў адстойваць сваю нацыянальную адметнасць і неўміручасць.

* * *

Задачу пісьменніка У. Гніламёдаў бачыць у тым, каб пісаць «проста, шчыра, немудрагеліста, дасціпна» [11, 4]. Пры гэтым ён перакананы, што «жыццё павінна пранікнуць у твор пісьменніка ўсімі магчымымі спосабамі, пранікнуць праз самога аўтара, яго арганіку, пачуццё крыві, жывёльную эманацыю, пах. Тое, што ідзе ад голага лагізавання, ад абстрактнага, — забівае літаратуру» [14, 11]. Нам надаецца, што з усімі гэтымі задачамі аўтар «Хронікі» справіўся паспяхова.

Пісьменнік лічыць сябе наратыўшчыкам і постмадэрністам адначасова. Наратыўшчык у «Хроніцы» дамінуе, бо ў асобе празаіка сфармаваўся творца найперш традыцыйна нацыянальнага, класічнага пісьма. Творца, які працуе галоўным чынам у фармаце рэалістычна-псіхалагічнага апавядання, імкнучыся ў межах гэтага фармата сублімаваць розныя стылі і жанры. У. Гніламёдаў не абмяжоўваецца бытапісальніцтвам, псіхалагізмам, а натуральна ўключае ў мастацкую прастору дакумент, гістарычную хроніку, метафару, элементы сімволікі, народную песню. Да гэтага трэба дадаць іскрамётны гумар, сакавітую гутарковую мову.

«Хроніка» У. Гніламёдава — гэта твор, які з вялікай сілай выражае ўнутранае памкненне нацыянальнай літаратуры да эпасу, памкненне ўвасобіць свет-універсум у адзінстве яго прыродных і гістарычных сувязей. У адзінстве Чалавека і света. А таксама твор-перасцярога — аб страце гэтага адзінства.

*Літаратура*


1. Гараднiцкi, Я. А. Мастацкі свет беларускай літаратуры XX стагоддзя / Я. А. Гараднiцкi. — Мінск: Бел. навука, 2005. — 206 с.
2. Гачев, Г. Д. Национальные образы мира / Г. Д. Гачев. — М.: Сов. писатель, 1988. — 445 с.
3. Гніламёдаў, У. Уліс з Прускі: раман / У. Гніламёдаў. — Мінск: Маст. літ., 2006. — 382 с.
4. Гніламёдаў, У. Расія: раман / У. Гніламёдаў. — Мінск: Маст. літ., 2007. — 672 с.
5. Гніламёдаў, У. Вяртанне: раман / У. Гніламёдаў. — Мінск: Маст. літ., 2008 — 429 с.
6. Гніламёдаў, У. Валошкі на мяжы: раман / У. Гніламёдаў // Полымя. — 2009. — № 8.
7. Тамсама. — 2009. — № 9.
8. Тамсама. — 2010. — № 9.
9. Тамсама. — 2011. — № 1.
10. Тамсама. — 2011. — № 2.
11. ЛіМ. — 2007. — 19 кастрычніка.
12. ЛіМ. — 2007. — 28 снежня.
13. Гніламёдаў, У. Я заўсёды іду ад факта… / У. Гніламёдаў // Полымя. — 2007. — № 12. — С. 133 — 148.
14. Гніламёдаў, У. Сем гадоў у ЦК: раман-дзённік / У. Гніламёдаў // Полымя. — 2011. — № 9.


(*Полымя. 2009. № 2*)